ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

***SCIENTISTS OF BELARUS***

# ГЕНАДЗЬ МІХАЙЛАВІЧ ЛЫЧ
## (Да 85-годдзя з дня нараджэння)



Генадзь Міхайлавіч Лыч нарадзіўся 25 лютага 1935 г. у вёсцы Магільнае Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Выхоўваўся ў сям'і селяніна, скончыў Магільнянскую сярэднюю школу (1953 г.), затым Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава (1958 г.), дзе і атрымаў спецыяльнасць эканаміста.

У 1958–1961 гг. Генадзь Міхайлавіч працаваў на Брэсцкай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі спачатку малодшым навуковым супрацоўнікам, потым загадчыкам аддзела эканомікі. У 1964 г. ён паспяхова скончыў аспірантуру пры Усесаюзным НДІ гідратэхнікі і меліярацыі імя А. М. Касцякова і па размеркаванні працаваў старшым навуковым супрацоўнікам у Беларускім НДІ эканомікі і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. У 1965 г. атрымаў вучоную ступень кандыдата эканамічных навук за даследаванне, у якім распрацаваў якасна новы метадалагічны падыход да вызначэння эканамічнай эфектыўнасці асушальных меліярацый у зоне няўстойлівай і залішняй вільготнасці.

З 1967 г. Г. М. Лыч працягваў распрацоўку праблем эканамічнай эфектыўнасці сельскагаспадарчых меліярацый у Беларускім НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі, дзе амаль да канца 1977 г. узначальваў Аддзел эканомікі меліярацыйнага і воднагаспадарчага будаўніцтва. Па выніках гэтых даследаванняў падрыхтаваў і ў 1972 г. абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Эканамічная эфектыўнасць асушальных меліярацый», а ў 1973 г. атрымаў вучоную ступень доктара эканамічных навук. У 1977 г. яму было прысуджана вучонае званне прафесара.

З канца 1977 і па 1988 г. Г. М. Лыч працаваў першым намеснікам дырэктара на навуковай рабоце Беларускага НДІ эканомікі і арганізацыі сельскай гаспадаркі. З пераходам на новую пасаду кола яго навуковых інтарэсаў істотна пашырылася. Прынамсі, свае даследаванні па эканамічнай эфектыўнасці капітальных укладанняў ён распаўсюдзіў на ўсе напрамкі, звязаныя з развіццём аграрнай галіны. Вынікі адзначаных навуковых даследаванняў былі прызнаны на агульнасаюзным узроўні, што дазволіла яму стаць адным з асноўных аўтараў першых у гісторыі айчыннай аграрнай эканамічнай навукі Метадычных рэкамендацый па вызначэнні эканамічнай эфектыўнасці капітальных укладанняў у сельскую гаспадарку, якія былі зацверджаны Усесаюзнай акадэміяй сельскагаспадарчых навук імя У. І. Леніна.

Акрамя таго, Генадзь Міхайлавіч актыўна займаўся даследаваннем шэрага іншых актуальных праблем аграрнай эканомікі, у прыватнасці размяшчэння, спецыялізацыі і канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, эканамічнай эфектыўнасці вядзення раслінаводства і жывёлагадоўлі. У якасці намесніка галоўнага рэдактара прыняў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы другога выдання «Сістэмы вядзення сельскай гаспадаркі Беларускай ССР». Навуковыя дасягненні Г. М. Лыча таго часу былі ўшанаваны наданнем ганаровага звання «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь» у 1980 г. і выбраннем членам-карэспандэнтам АН БССР у 1986 г.

На гэты ж перыяд прыпаў і найбольш актыўны ўдзел Генадзя Міхайлавіча ў дзейнасці таварыства «Веды». Ён быў абраны членам Прэзідыума рэспубліканскага таварыства «Веды», у якім узначальваў навукова-метадычную секцыю па прапагандзе сельскагаспадарчых ведаў, а затым

і членам пленума Усесаюзнага таварыства «Веды». За заслугі ў прапагандзе навуковых ведаў у 1989 г. быў ушанаваны вышэйшай узнагародай Усесаюзнага таварыства «Веды» – медалём імя акадэміка С. І. Вавілава.

У 1988 г. адбыўся пераход Г. М. Лыча ў Акадэмію навук, з якой з гэтай пары і быў звязаны далейшы творчы лёс вучонага. Са студзеня 1988 г. ён узначальваў Аддзел аграрных праблем сацыялізму Інстытута эканомікі, а з кастрычніка гэтага ж года стаў дырэктарам інстытута.

З гэтага часу асноўную ўвагу ў сваіх даследаваннях Генадзь Міхайлавіч надаваў праблемам макраэканомікі, прынамсі, распрацоўцы эканамічнага механізма гаспадарання, у тым ліку ва ўмовах пераходу ад адміністрацыйна-каманднай да рыначнай эканомікі. У той жа час, займаючы пасаду дырэктара акадэмічнага Інстытута эканомікі, ён актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы самых розных нарматыўных заканадаўчых дакументаў па рыначным рэфармаванні беларускай эканомікі. У прыватнасці, стаў адным з асноўных аўтараў «Канцэпцыі эканамічнага суверэнітэту Беларускай ССР», якая была прызнана лепшай сярод аналагічных канцэпцый іншых саюзных рэспублік і ў якасці ўзору надрукавана на старонках усесаюзнага друку, а таксама «Праграмы пераходу Беларускай ССР да рыначнай эканомікі».

З 1992 па 1997 г. Г. М. Лыч – акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў. Знаходзячыся на гэтай пасадзе, разам з некаторымі іншымі вядучымі навуковымі супрацоўнікамі Аддзялення ажыццявіў распрацоўку Канцэпцыі палітыка-прававога, сацыяльна-эканамічнага і нацыянальна-культурнага адраджэння і развіцця Рэспублікі Беларусь і правёў па гэтай праблеме тры пашыраныя навуковыя сесіі Аддзялення з удзелам палітычных і дзяржаўных дзеячаў, а таксама шырокага кола прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі.

Гэтыя навуковыя сесіі атрымалі шырокі грамадскі водгук і адыгралі немалаважную ролю ў адраджэнні нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Акрамя таго, у адзначаны перыяд пад кіраўніцтвам Г. М. Лыча і пры яго непасрэдным удзеле была падрыхтавана першая ў гісторыі незалежнай Беларусі Нацыянальная справаздача аб чалавечым развіцці «Беларусь: тварам да чалавека», якая атрымала высокую ацэнку з вуснаў тагачаснага генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Бутраса-Бутраса Галі. Найбольш важныя палажэнні справаздачы публікаваліся на старонках рэспубліканскага друку, каб давесці іх да ведама шырокай грамадскасці.

З 1997 г. Генадзь Міхайлавіч зноў вярнуўся на пасаду дырэктара Інстытута эканомікі, якую пяць папярэдніх гадоў займаў на грамадскіх пачатках, а з 1998 г. перайшоў на пасаду галоўнага навуковага супрацоўніка, засяродзіўшыся на правядзенні фундаментальных эканамічных даследаванняў, спачатку па сацыяльна-эканамічных праблемах забеспячэння экалагічнай бяспекі жыццядзейнасці грамадства, у тым ліку мінімізацыі негатыўных наступстваў Чарнобыльскай катастрофы, а затым па праблемах міжнародных эканамічных адносін у галіне знешняга гандлю сельскагаспадарчымі і харчовымі таварамі. Па выніках навуковых даследаванняў па чарнобыльскай праблеме падрыхтаваў і ў 1999 г. апублікаваў у суаўтарстве манаграфію «Чарнобыльская катастрофа: сацыяльна-эканамічныя праблемы і шляхі іх вырашэння», у якой упершыню была даведзена колькасная ацэнка шкоды, якую прычыніла аварыя на Чарнобыльскай АЭС нацыянальнай эканоміцы і сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь. Яна была прызнана на афіцыйным узроўні і шырока выкарыстоўвалася ў шматлікіх выступленнях Прэзідэнта краіны і іншых палітычных і дзяржаўных дзеячаў.

З 2009 г. Г. М. Лыч – вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі, дзе займаецца даследаваннем праблем аграрнай эканомікі, якія заўсёды яго хвалявалі.

Генадзь Міхайлавіч – аўтар больш за 360 навуковых прац, у тым ліку 17 манаграфій. Яго публікацыі вызначаюцца не толькі актуальнасцю і аргументаванасцю вывадаў і прапаноў, але і прынцыповасцю аўтарскай пазіцыі па спрэчных пытаннях, што нязменна выклікае да іх жывы інтарэс з боку шырокай навуковай грамадскасці.

Акрамя навукова-арганізацыйнай дзейнасці з канца 1980-х гг. Г. М. Лыч пачаў актыўна займацца публіцыстыкай. Па шырокаму колу самых злабадзённых пытанняў нашага грамадскага развіцця ім апублікаваны цэлы шэраг публіцыстычных артыкулаў і чатыры навукова-папулярныя кнігі: «Інтэлектуальная дзірка» (Мінск, 1998), прысвечаная пытанням навукі, найперш гуманітар-

най і сацыяльнай, і жыццядзейнасці навуковай інтэлігенцыі; «Пакутлівыя блуканні» (Мінск, 2000), у якой адлюстраваны шматлікія цяжкасці, з якімі сустрэлася Беларусь на шляху пераходу ад цэнтралізавана-планавай да рыначнай эканомікі; «Народам звацца» (Мінск, 2001), у якой абгрунтоўваецца неабходнасць захавання і ўмацавання эканамічнага і палітычнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, і «Трагедыя беларускага сялянства» (Мінск, 2003), прысвечаная асэнсаванню цяжкага лёсу беларускага сялянства на працягу многіх стагоддзяў.

Сваю даследчую, навукова-арганізацыйную і педагагічную працу Генадзь Міхайлавіч паспяхова спалучаў з актыўнай грамадскай дзейнасцю. Ён быў членам Нацыянальнага камітэта Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, старшынёй Мінскага абласнога і членам Прэзідыума рэспубліканскага таварыства «Веды».

Гледзячы назад у мінулае, думаецца, можна смела сцвярджаць: наўрад ці нават мог марыць вясковы хлапчук, які рос без апоры на бацькоўскія плечы, аб тым, што пройдзе час і ён дасягне самых высокіх навуковых ступеняў і званняў, узначаліць вядомыя і аўтарытэтныя навуковыя ўстановы. Але зайздросная працавітасць, арганізаванасць і талент, што заўсёды вылучалі Генадзя Міхайлавіча, зрабілі сваю добрую справу.

Яго творчы шлях – гэта яшчэ адно пацвярджэнне правільнасці слоў класіка, які сказаў, што ў навуцы няма шырокай прамой дарогі і толькі той можа дасягнуць яе вяршынь, хто не баіцца стомленасці і крок за крокам узнімаецца ўверх па яе камяністых сцежках.

Дасягнутым Генадзь Міхайлавіч не цешыць сябе, а, як звычайна, працуе. Таму і сваё 85-годдзе сустракае за пісьмовым сталом. Нязгасная прага даследчыка, мэтанакіраванасць, няўрымслівасць працаўніка даюць яму новую творчую энергію. Жадаем юбіляру моцнага здароўя, здзяйснення ўсіх планаў і задум.

*Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*